ГАРАЧЫЯ. ЗІМОВЫЯ... НАШЫ!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Дар'я паўтарыла дасягненне легендарнай нямецкай біятланісткі Каці Вільхельм, якая таксама — трохразовая алімпійская чэмпіёнка. Але яна заваёўвала свае ўзнагароды на дзвюх алімпіядах — дзве ў Солт-Лэйк-Сіці і яшчэ адну — у Турыне (да таго ж апошні медаль дастаўся ёй у эстафеце). Домрачава ж стала першай біятланісткай у свеце, якая выйграла тры залатыя медалі на адной Алімпіядзе, і толькі ў індывідуальных гонках. Сёння ўжо без перабольшвання можна казаць: Дар'я — наймацнейшая ў свеце!

— Я зрабіла гэта для вас, для ўсёй Беларусі, — ***першыя словы трыумфатаркі пасля фінішу.*** *— Дзякуй вам за неверагодную падтрымку, за веру ў мяне! Я вельмі стамілася. І рада, што ўсе гэтыя доўгія гонкі закончыліся.*

— А якія пачуцці перажывае цяпер спартсменка, якая — тройчы — мацнейшая за ўсіх?

— Упэўненасць. Цяпер я ведаю, што магу выконваць сваю работу сапраўды на самым высокім узроўні. Адчуваю цяпер, што стала прафесіяналам сваёй справы. Гэта — галоўнае.

— Якая з трох «залатых» гонак была самай складанай — па цяжкасці трасы, па бегу, па якасці стральбы, па псіхалагічным напружанні, нарэшце?

— Цяжкая... Апошняя, думаю. Бо з кожнай новай гонкай назапашваецца стомленасць, перапынкі ў некалькі дзён не даюць магчымасці аднавіцца цалкам. Гэта можна было бачыць і сёння на трасе. І гэта не толькі ў мяне так. Вы паглядзіце, колькі біятланістак сёння ўпалі на дыстанцыі — тая ж Тора Бергер... Што казаць пра іншых. Але цяпер у нас усіх ёсць нагода радавацца. Сёння магу сказаць, як і на папярэдніх гонках, вельмі добра працавалі лыжы. Калі казаць пра стомленасць — усе стаміліся. І я таксама. Але ўсё-такі разумела, што знаходжуся ў дастаткова добрай форме і магу змагацца да канца. На дыстанцыі ўвесь час адчувала, што раблю тую справу, якую сапраўды люблю, — і гэтае пачуццё таксама вельмі дапамагала.

— Як паўплывала на падрыхтоўку да старту надвор'е, якое вырашыла крыху пакапрызнічаць?

— Я да такіх стаўлюся па-філасофску: у мяне ўжо назапашаны сур'ёзны вопыт у біятлоне, і ніякія каляспартыўныя моманты (да іх можна аднесці і надвор'е, якім бы яно ні было) не выбіваюць мяне з каляіны. Будзе гонка — дык будзе, не будзе — пачакаем.

Фота БЕЛТА.

— Такое пытанне: ці не перашкаджае вам шуміха, якая разгарнулася і тут, у асяроддзі балельшчыкаў, і на радзіме вакол гучных перамог беларусаў?

— Самае галоўнае — гэта нават не само званне чэмпіёна. Самае галоўнае для спартсмена, я лічу, — гэта незабыўныя эмоцыі, якія ён атрымлівае падчас барацьбы, аддаючы ўсе свае сілы дзеля дасягнення поспеху. Гэта пераадоленне самога сябе. Прыемна адчуваць, што ты — мацнейшы за саперніка. Вось гэтыя эмоцыі і ёсць самае лепшае, што мы можам атрымліваць ад жыцця, а не проста медалі і тытулы.

— Толькі што стала вядома, што Аляксандр Лукашэнка прысвоіў табе званне Героя Беларусі.

— Я вельмі ганаруся гэтым. Гучыць проста неверагодна. Цяжка паверыць, што я стала трохразовай алімпійскай чэмпіёнкай і атрымала званне Героя Беларусі. Складана выразіць словамі мае пачуцці. Пакуль не ўсвядоміла. Усё гэта прыйдзе крыху пазней...

А ўжо літаральна праз гадзіну пасля гэтых слоў мы зноў ўскочылі на трыбуне: наш фрыстайліст Антон Кушнір стаў алімпійскім чэмпіёнам.

У фінальным раўндзе спаборніцтваў у экстрым-парку «Ружа Хутар» 29-гадовы мінчанін выканаў неверагодны скачок з найвышэйшым каэфіцыентам складанасці і атрымаў найвышэйшую адзнаку сярод усіх канкурэнтаў — 134,50 бала. Сярэбраны прызёр аўстраліец Дэвід Морыс адстаў вельмі далёка — у яго 110,41 бала, а ўладальнікам «бронзы» стаў кітайскі спартсмен Цзя Цоньянь — 95,06 бала.

Чатыры гады таму Антон стаў уладальнікам вялікага Хрустальнага глобуса за перамогу ў агульным заліку Кубка свету і лічыўся адным з галоўных фаварытаў Алімпіяды ў Ванкуверы. Аднак тады ён няўдала выканаў другі скачок і не змог удзельнічаць у размеркаванні ўзнагарод.

Цяпер склалася ўсё: і надвор'е, і здароўе, і суддзі, якія ў гэтым выключна суб'ектыўным відзе спорту праявілі рэдкую аднадушнасць пры выстаўленні ацэнак. А вось меркаванне самога чэмпіёна:

— Знаходжуся ў сапраўдным шоку! — ***кажа Антон.*** *— Адчуваю вялікую стомленасць і вельмі вялікую радасць з-за таго, што сённяшні дзень для мяне склаўся ўдала. Я верыў у перамогу на Алімпіядзе і вельмі яе жадаў. Я зрабіў усё, што мог! Выступаючы, не думаў пра балы. Пры тым судзействе, якое было што ў жаночай, што ў мужчынскай праграмах, атрыманай ацэнцы я нават трохі здзівіўся. Яна сапраўды вельмі высокая.*

— А як вам новы фармат правядзення спаборніцтваў? Раней для перамогі дастаткова было выканаць два скачкі. Цяпер жа да залатога медаля чатыры-пяць разоў трэба выходзіць на трамплін.

— Я не звяртаў на гэта ўвагі — скакаў, колькі трэба было. Хоць сапраўды: спаборніцкі дзень стаў прыкметна больш цяжкім і працяглым. Трэба затраціць значна больш і фізічных, і псіхалагічных сіл. Але я не магу скардзіцца: правілы для ўсіх аднолькавыя і з імі трэба пагадзіцца.

— Антон, што вы самі можаце сказаць пра гэты неверагодны скачок?

— Шмат разоў, на розных спаборніцтвах, яго рабіць не трэба. Калі выходзіш на пік формы, толькі тады яго варта практыкаваць. Ён патрабуе высокай канцэнтрацыі, а выконваць яго трэба ў выключных выпадках на спаборніцтвах. Я вельмі рады, што ўсё склалася ўдала да фіналу і ў апошняй спробе. Мая першая думка была: ну вось, я на нагах, усё атрымалася. Далей няхай стараюцца канкурэнты. А яны... відаць, занерваваліся, псіхалагічна зламаліся. Усё-такі скакаць у ліку першых — вялікая перавага (у Алы Цупер была аналагічная сітуацыя).

— Ці ўспаміналі вы напярэдадні мінулую, няўдалую для сябе Алімпіяду ў Ванкуверы, дзе перажылі сапраўднае расчараванне?

— У камандзе мы прааналізавалі той старт і зробленыя там памылкі. На гэты раз я настройваўся такім чынам, што поспех проста павінен быў абавязкова павярнуцца да мяне тварам. Рад, што змог перамагчы сябе і прадэманстраваць свой сапраўдны ўзровень.

— Каму прысвячаеце гэтую перамогу?

— Галоўнаму трэнеру нацыянальнай зборнай па фрыстайле Мікалаю Іванавічу Казеку, свайму першаму трэнеру Галіне Досавай, а таксама — родным, блізкім, балельшчыкам і ўсім тым людзям, без якіх гэтая перамога была б немагчымай. Сёння мяне падтрымлівала жонка Наташа з сынам. У нашай сям'і чакаецца папаўненне, але, нягледзячы на гэта, Наталля заставалася на трыбунах да заканчэння спаборніцтваў. Прыехалі падтрымаць таксама родная сястра з мужам. Прысутнасць гэтых людзей надала сіл і ўпэўненасці падчас спаборніцтваў.

А што думае пра трыумф сваіх падапечных **Мікалай Казека, галоўны трэнер нацыянальнай зборнай па фрыстайле, спецыяліст, які на дзвюх апошніх Алімпіядах выхаваў траіх чэмпіёнаў?**

— Граматная тактыка выступленняў і надзвычайны настрой на перамогу сталі галоўнымі складнікамі «залатога» трыумфу Антона Кушніра, — каментуе Мікалай Іванавіч адразу пасля заканчэння спаборніцтваў. — Чаму ў Антона атрымаўся скачок, які змяшчае трайное сальта з пяццю вінтамі? Ён выступаў з ім на чэмпіянаце свету, выйграваў этапы Кубка свету. У барацьбе на Алімпіядзе адна справа асмеліцца яго выконваць, а другая — вытрымаць псіхалагічна. Настрой у яго быў надзвычайны, таму ўсё атрымалася, і ў тактыцы мы не памыліліся. У Дзімы Дашчынскага таксама настрой быў выдатны, але нешта не склалася ў сярэдзіне спаборніцтваў. Не зусім магу зразумець, чаму, выконваючы першы скачок, ён не мог разняволіцца.

Сёння, дарэчы, некаторыя могуць гаварыць пра планы аб завяршэнні спартыўнай кар'еры Аляксеем Грышыным і Дзмітрыем Дашчынскім пасля безмедальнага выступлення ў Сочы. Аднак я прапаную не спяшацца выкрэсліваць іх са спіса дзеючых атлетаў. Наколькі мне вядома, яны збіраліся развітацца з вялікім спортам на чэмпіянаце свету наступнага года. Але, як складзецца, загадваць не бярусь.

Хачу прызнацца, што спачатку не разлічваў на заваяванне нашымі фрыстайлістамі двух залатых медалёў — у жаночай і мужчынскай праграмах. Хоць і не сумняваўся ў іх майстэрстве і заўсёды ведаў, што яны здольныя змагацца за самыя высокія месцы.

Так, гэтая Алімпіяда — найлепшая з усіх, дзе ўдзельнічалі айчынныя спартсмены. Не толькі сярод «белых» Алімпіяд — наогул. Шэсць медалёў на сёння, пяць з іх — залатыя. Лічу, што гэтыя высокія вынікі абумоўлены паступальным развіццём спорту вышэйшых дасягненняў у нашай краіне і праграмамі яго падтрымкі з боку дзяржавы. Залаты алімпійскі медаль — гэта ўрачыстасць духу спартсмена, які ішоў да галоўнай узнагароды свайго жыцця па цярністым шляху, часам праз траўмы і боль.

— Божа, Беларусь — вялікая спартыўная нацыя — не пабаюся гэтых слоў: Домрачава, Цупер, Кушнір — наш гонар. Вось гэта сіла, вось гэта дух і воля да перамогі! — казаў, хапаючы мяне за куртку **Артур**, які прыехаў сюды з Мінска, каб падтрымаць свайго сябра Дзіму Дашчынскага.

Дзіма крыху не дацярпеў. Да медаля не дацягнуў. Але абяцаў вярнуцца на трамплін. Каб таксама паставіць тлустую кропку.

Фота БЕЛТА.

■ Напярэдадні чэмпіянату

ЗАДАВОЛЕНЫЯ ГОСЦІ — ГЭТА СМАЧНА НАКОРМЛЕНЫЯ ГОСЦІ

Арганізацыя грамадскага харчавання падчас правядзення чэмпіянату свету па хакеі 2014 года павінна быць на самым высокім узроўні.

Пра гэта гаварылася на чарговым пасяджэнні падкамітэта па пытаннях гандлёвага забеспячэння і арганізацыі харчавання ў рамках падрыхтоўкі да чэмпіянату, якое прайшло на чале з міністрам гандлю Валянцінам Чэканавым. На ім былі дэталёва разгледжаны пытанні арганізацыі функцыянавання зон гасціннасці, прыблізны асартымент страў беларускай нацыянальнай кухні, які будзе прапанаваны ў аб'ектах грамадскага харчавання на перыяд правядзення чэмпіянату (з улікам забеспячэння высокай якасці страў і вырабаў і абгрунтаванага фарміравання рознічных цэн), забеспячэння аб'ектаў грамадскага харчавання сыравінай айчыннай вытворчасці.

Міністр гандлю адзначыў, што праведзена значная праца па падрыхтоўцы аб'ектаў гандлю, грамадскага харчавання, бытавога абслугоўвання да правядзення чэмпіянату свету і ў той час, які застаўся, неабходна сканцэнтраваць намаганні на дэталёвай дапрацоўцы ўсіх складнікаў для забеспячэння высокага ўзроўню абслугоўвання. Ён таксама падкрэсліў, што асаблівую ўвагу пры арганізацыі харчавання ўдзельнікаў і гасцей сусветнага першынства трэба надаць захаванню санітарна-гігіенічных нормаў, бяспецы тых прадуктаў, што будуць пастаўляцца.

Плануецца, што адным з пытанняў, якое будзе абмеркавана на наступным пасяджэнні падкамітэта, стане арганізацыя валанцёрскага руху падчас правядзення чэмпіянату.

Сяргей РАСОЛЬКА

■

Даты | Падзеі | Людзі

1473 год — у польскім горадзе Торунь нарадзіўся Мікалай Капернік. Пройдуць стагоддзі — і ў гэтым горадзе паставяць помнік вялікаму астраному, а на п'едэстале напішуць: «Той, які спыніў Сонца і зрушыў Зямлю». Геліяцэнтрычная карціна свету, створаная Капернікам, была пераваротам у навуцы, хоць астраном дапускаў толькі тое, што Зямля круціцца вакол Сонца, якое і змясціў у цэнтр светабудовы.

1855 год — у гэты дзень з'явілася першая карта надвор'я. Яе склаў Урбэн Левер'е, дырэктар Парыжскай астранамічнай абсерваторыі, па даручэнні французскага ўрада пасля катастрафічнай буры 14 лістапада 1854 г. На першай карце надвор'я былі намаляваныя лініі роўнага ціску — ізабары, замкнёныя па форме. Як аказалася, цыклоны (вобласці нізкага ціску) і антыцыклоны (вобласці высокага ціску) рухаюцца па пэўных законах і, ведаючы іх, можна прадказваць будучае надвор'е ў любым пункце зямлі. Сучасная сінаптычная карта, вядома, вельмі адрозніваецца ад сваёй «прабабулі» па насычанасці і нагляднасці, але сутнасць яе засталася ранейшай.

1924 год — нарадзіўся (г. Масква) Антоній (у свеце Мельнікаў Анатоль Сяргеевіч), дзеяч і гісторык праваслаўнай царквы ў Беларусі, доктар багаслоўя (1981). З 1956 г. архімандрыт Жыровіцкага Успенскага манастыра, рэктар Мінскай (1956-1963) духоўнай семінарыі. З мая 1965 г. епіскап, з кастрычніка 1965 года архіепіскап, з 1975 па 1978 год — Мітрапаліт Мінскі і Беларускі. Вывучаў гісторыю Жыровіцкага манастыра, гісторыю праваслаўя ў Беларусі ў 1917-1962 гг. Сабраў калекцыю старажытнага беларускага ткацтва.

Было сказана

Якуб КОЛАС, народны паэт Беларусі:

«Часамі самае маленькае знаходзіцца ў блізкай і цеснай сувязі з самым вялікім. Трэба толькі ўмець знайсці месца іх стыку».

■ Хочаце — верце

ЧАТЫРЫ СТЫХІІ: З КІМ СЯБРАВАЦЬ, КАГО КАХАЦЬ?

Як знайсці ў жыцці блізкую па духу сяброўку, каханага? Не маюць рацыі тыя, хто лічыць, што ўсё адбываецца выпадкова. Мне давялося пабываць у Тыбеце, Манголіі, Кітаі, Сібіры, Закаўказзі... Я сустракаўся з мудрымі людзьмі — святарамі, навукоўцамі, практыкамі, энтузіястамі. І мне здаецца, назапашаныя чалавецтвам веды павінны дапамагчы разабрацца ў пошуку адказу на такое цікавае пытанне: дзе шукаць сяброўства, каханне, што ўлічыць у стасунках з блізкімі людзьмі?

Для пачатку, я думаю, варта разабрацца ў некаторых асаблівасцях унутраных і знешніх якасцяў чалавека — тэмпераментах. Тэмперамент азначае асаблівасці псіхічнай дзейнасці, а таксама тэмп, рытм, інтэнсіўнасць псіхічных працэсаў і фізічнай актыўнасці, эмацыйнасць. Тэмперамент — гэта адзіны прыродны пачатак, аснова. Сама прырода вызначае склад нашага характару, нашы звычкі і манеру паводзін.

САНГВІНІК — чалавек настрою, рухавы, хутка ўзбуджальны, параўнальна лёгка перажывае няўдачы і непрыемнасці, непастаянны.

МЕЛАНХОЛІК — уразлівы, лёгкаранімы, схільны глыбока перажываць нават нязначныя няўдачы, але знешне вяла рэагуе на навакольнае, іпахондрык або ідэаліст у справах.

ХАЛЕРЫК — хуткі, імпэтны, здольны аддавацца справе з выключным запалам, неўраўнаважаны, схільны да бурных эмацыйных успышак, рэзкіх змен настрою.

ФЛЕГМАТЫК — марудлівы, спакойны, з устойлівымі імкненнямі і больш пастаянным настроем, са слабым знешнім выяўленнем душэўных станаў.

«Чыстыя» тыпы тэмпераменту сустракаюцца рэдка. Тып тэмпераменту залежыць ад прыроджаных фізіялагічных асаблівасцяў і ад таго, што дзіця атрымлівае звонку. Як вызначыць асаблівасці тэмпераменту, уласцівыя кожнаму з нас? З дапамогай спецыяльных псіхалагічных тэстаў, напрыклад. Дарэчы, дагэтуль няма адзінага спосабу вызначэння тэмпераментаў. Што ж, паспрабуем улічыць гэтыя асаблівасці чалавека, закладзеныя ў цыкле нараджэння, згодна з чатырма стыхіямі (ВАДА, ЗЯМЛЯ, ПАВЕТРА, АГОНЬ). Зямля адпавядае меланхалічнаму тэмпераменту, Вада — флегматычнаму, Паветра — сангвінічнаму, Агонь — халерычнаму. **Зямля — гэта народжаныя 1 студзеня — 19 студзеня, 20 красавіка — 19 мая, 20 жніўня — 19 верасня, 20 снежня — 31 снежня. Вада — 20 лютага — 19 сакавіка, 20 чэрвеня — 19 ліпеня, 20 кастрычніка — 19 лістапада, Паветра — 20 студзеня — 19 лютага, 20 мая — 19 чэрвеня, 20 верасня — 19 кастрычніка, Агонь — 20 сакавіка — 19 красавіка, 20 ліпеня — 19 жніўня, 20 лістапада — 19 снежня.**

Кожны з чатырох умоўных тыпаў тэмпераменту мае такія асаблівасці мыслення і паводзін, якія не мяняюцца на працягу ўсяго жыцця. У гэтым сэнсе чалавек не мяняецца. Знакі вызначаюць і адносіны паміж людзьмі. Неабходна памятаць, што ёсць знакі проціглеглыя: Зямля і Паветра, Вада і Агонь. Узаемаадносіны людзей, якія нарадзіліся пад гэтымі знакамі, не дадуць дастаткова шчырай, трывалай дружбы, стабільнай, добрай сям'і. Людзі розных, супрацьлеглых характараў, з вялікай цяжкасцю могуць знайсці агульныя інтарэсы, і, хутчэй за ўсё, ненадоўга.

Аднолькавыя знакі не адштурхоўваюцца, хоць некаторыя нязначныя, дробязныя рознагалоссі, расчараванні, папрокі цалкам магчымыя. Але тут не можа ісці гаворка пра ўзаемную нянавісць, варожасць, непрыязнасць. Кожнаму партнёру ў падобным саюзе блізкіх знакаў трэба быць гатовым да мікраскапічных непрыемнасцяў, якія, тым не менш, не павінны прывесці да разрыву адносін. Нам здаецца, што дробныя канфлікты псуюць наша жыццё, а насамрэч яны стымулююць нашы пачуцці, правяраюць іх на трываласць, прымушаюць блізкіх людзей больш увагі надаваць адно аднаму. Галоўнае, што сяброўства і каханне паміж людзьмі аднолькавых знакаў будзе ўзаемным.

Людзям супрацьлеглых знакаў вельмі складана падтрымліваць перспектыўныя справы, заключаць афіцыйныя сямейна-шлюбныя саюзы. Такія людзі нярэдка ствараюць сям'ю або становяцца блізкімі сябрамі, як кажуць, па разліку або спадзеючыся на ўдачу. Сур'ёзныя скандалы, разлады магчымыя паміж Зямлёй і Паветрам, Вадой і Агнём. У мінімальна супрацьлеглых знакаў (Зямля — Агонь, Вада — Паветра) падобныя рызыкі ва ўзаемаадносінах меншыя. Зямля дрэнна суседнічае з Паветрам, з Агнём, падвяргаючыся, вобразна кажучы, ветравой эрозіі і высушвальнаму пеклу. У сваю чаргу, Ваду сушыць, выпарвае Агонь. Што да Паветра, то яно дапамагае Агню, раздзімаючы полымя, «налятае» на рэкі і азёры ветравымі бурамі, выклікаючы патопы і паводкі. Зямля тушыць Агонь і закрывае доступ Паветру. Вада з цяжкасцю прапускае Паветра і лёгка тушыць Агонь. Прыродныя дзеянні цалкам адпавядаюць характару паводзін людзей.

Усходняя мудрасць паказвае на аптымальна блізкія адносіны паміж знакамі Зямля—Вада, Агонь—Паветра. Тут і канфлікты нязначныя, і блізкасць інтарэсаў аптымальная. Гарантаваць 100-працэнтную «блізкасць душ», вядома, немагчыма, але, тым не менш... Дарэчы, названыя асаблівасці варта ўлічваць не толькі ў адносінах з каханымі і сябрамі, але і пры зносінах з дзецьмі, бацькамі, суседзямі і г.д.

Сяргей АНУПРЫЕНКА, доктар філасофскіх навук

■

НАРОДЖАНЫЯ 19 лютага

Практычнасць, уважлівасць і мэтанакіраванасць характарызуюць гэтых людзей. Яны любяць прыкладаць намаганні, каб зрабіць нешта новае, каб дайсці да мэты. Іх шлях да поспеху — пераадольванне цяжкасцяў і перашкод. Аднак вялікая частка іх поспеху дасягаецца дзякуючы ведам калег і асабліва падтрымцы сям'і і блізкіх сяброў, што падкрэслівае іх здольнасці да кіраўніцтва. Іх паважаюць за таленты, лічаць ураўнаважанымі, непахіснымі і надзейнымі людзьмі. Адзіны іх мінус — нявыхаванасць і адсутнасць клопату аб навакольных, а вось веды, актыўнасць, поспех і магчымасць ясна мысліць абяцаюць ім павагу і ўзнагароду за працу.

Дарагую матулю, Ірыну Мікалаеўну КОЗАК, АД УСЁЙ ДУШЫ ВІНШУЕМ З ЮБІЛЕЕМ!

Сказать «спасибо» – это мало,
Мы все в долгу перед тобой.
Дай Бог тебе здоровья, мама, –
Желанье всей семьи большой.
Твое тепло, твое добро,
Всегда оно нас окружает,
И на душе становится тепло,
Когда к тебе мы в гости приезжаем.

З Юбілеем!

З любоўю, дзеці.

СЁННЯ

Месяц

Апошняя квадра 22 лютага. Месяц у сузор'і Шаляў.

Імяніны

Пр. *Марыі, Хрысціны, Анатоля, Васіля, Дзмітрыя, Івана.*
К. *Альжбеты, Міраславы, Арнольда, Конрада, Міраслава, Пятра.*

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	8.21	18.26	10.05
Віцебск	8.13	18.13	10.00
Магілёў	8.11	18.16	10.05
Гомель	8.04	18.16	10.12
Гродна	8.35	18.42	10.07
Брэст	8.33	18.46	10.13

Фота Надзеі БУЖАН.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Выйдзеш за мяне замуж — будзеш жыць, як у казцы, Папялушка мая!

У школе.

— Вовачка, раскажы пра падарожжы Калумба.

— Значыць, так. Калумб не ведаў, куды ён прыплыў... А калі вярнуўся дадому, то не ведаў, адкуль...

Адкрыю мужчынам таямніцу: усе дзяўчаты могуць самастойна зашпіліць маланку на спіне!

— Якія адважныя ўчынкі вы рабілі ў сваім жыцці?

— Аднойчы на алгебры руку падняў.

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 22.315. Індэкс 63850. Зак. № 710.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 18 лютага 2014 года.